УДК [821.161.3:37012.1]Караткевіч

# ФІЛАСОФСКІЯ АСНОВЫ ГУМАНІСТЫЧНАГА ІДЭАЛУ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

***А. І. Бабко,*** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У творчым даробку Уладзіміра Караткевіча яскрава выяўляецца адданасць пісьменніка высокаму гуманістычнаму ідэалу. Гуманістычны характар яго светабачання мае глыбокія філасофскія асновы. Іх раскрыццю прысвечаны дадзены артыкул. Здзейсненая ў ім тэарэтычная эксплікацыя філасофскіх поглядаў У. Караткевіча грунтуецца на ідэі глыбокай блізкасці філасофскай пазіцыі пісьменніка да дыялектычнага іманентызму. Дыялектычны іманентызм разглядае творчы першапачатак рэчаіснасці як неад’емны і разам з тым супярэчлівым чынам прысутны ў ёй самой. У адпаведнасці з гэтым кожны чалавек выступае як яго непаўторны носьбіт, што абумоўлівае яго невымерную каштоўнасць. Такое бачанне чалавека паслядоўна ўвасабляецца ў творах У. Караткевіча, якія выступаюць як магутны покліч да гуманнага і справядлівага грамадства.

**Ключавыя словы:** гераічная асоба, гуманістычны ідэал, дыялектычны іманентызм, прыгажосць, светапогляд, творчасць, трансцэндэнтнае, філасофія, філасофскае мысленне.

# PHILOSOPHICAL FOUNDATIONS OF THE HUMANISTIC IDEAL OF ULADZIMIR KARATKEVICH

***A. Babko,*** *PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social Sciences and Humanities of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** Uladzimir Karatkevich's creative work clearly shows the writer's devotion to a high humanistic ideal. The humanistic nature of his worldview has deep philosophical foundations. This study is dedicated to their disclosure. The theoretical explication of Karatkevich's philosophical views carried out in it is based on the idea of deep closeness of the writer's philosophical position to dialectical immanentism. Dialectical immanentism considers the creative primary source of reality as in contradictory way inherent to it. Accordingly, each person acts as its unique carrier, which determines their immeasurable value. This vision of human being is consistently embodied in Karatkevich's works, which are a powerful call to a humane and just society.

**Keywords:** heroic personality, humanistic ideal, dialectical immanentism, beauty, worldview, creativity, transcendental, philosophy, philosophical thinking.

Светапогляд Уладзіміра Караткевіча прасякнуты высокім гуманізмам. У ім чалавеку надаецца статус найвялікшай каштоўнасці, надзвычай высока пісьменнік ацэньвае і закладзены ў чалавечай істоце творчы патэнцыял. Ён перакананы, што чалавек здольны арганічна і поўна ўвасобіць у сваім жыцці высокі, Боскі першапачатак – так, як гэта зрабіў галоўны герой рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Юрась Братчык, пра якога ў «Слове ад двох сведкаў», якім пачынаецца раман, гаворыцца: «І не быў ён Богам, а быў чалавек. Але для нас, чалавекаў, нават для тых, што ведалі яго, быў ён – Бог» [2, с. 9]. У эсэ «Подзвіг Францыска Скарыны» акрэсліваецца філасофская падстава гуманістычнага светабачання пісьменніка: «Мудрасць ведае адну веру – веру ў вялікае прызначэнне Чалавека, якога Прырода стварыла для поўнага і канчатковага спазнання самой сябе» [2, с. 178]. Задача дадзенага даследавання – паспрыяць тэарэтычнаму раскрыццю найважнейшых характарыстык гэтай падставы.

Цяжка сказаць, як адрэагаваў бы пісьменнік на характарыстыку яго філасофскіх поглядаў як надзвычай блізкіх да ідэй дыялектычнага іманентызму. Магчыма, эксплікацыя яго філасофскай пазіцыі ў мове прафесійнай філасофіі не надта спадабалася б яму, таму што сама прафесійная філасофія разглядаецца ім як досыць неадназначны феномен. Пісьменнік меркаваў, што «прафесіяналізацыя» філасофскай думкі нярэдка суправаджаецца яе дэгенерацыяй, і ўвогуле аддаваў перавагу «народнай філасофіі», «жывому» філасофскаму пошуку, шчыраму самастойнаму памкненню да праўды, якое не заменіць ніякая «прафесійная вывучка». Гэты ўзровень філасофскага мыслення ён лічыў не толькі значна больш цікавым, чым прафесійны, але ў пэўных выпадках і больш глыбокім [3, с. 243]. Тым не менш не выключана, што У. Караткевіч прыняў бы прыведзеную ў дадзеным даследаванні тэарэтычную рэканструкцыю філасофскага падмурку яго светабачання, бо прынцып дыялектычнага іманентызму, на якім яна грунтуецца і пры дапамозе якога раскрываецца агульны характар гэтага падмурку, падаецца ў найвышэйшай ступені адпаведным поглядам пісьменніка (хоць ён і не фармуляваў іх у згаданых тэрмінах).

Дыялектычны іманентызм інтэрпрэтуецца тут як канцэпцыя, паводле якой творчы першапачатак рэчаіснасці з'яўляецца яе неад'емнай унутранай характарыстыкай, а не трансцэндэнтнай, знешняй у дачыненні да яе сілай. Стваральная першаснова свету здзяйсняецца ў ім, аднак, у найвышэйшай ступені супярэчлівым – дыялектычным – чынам. З дадзенай канцэпцыі вынікаюць надзвычай важныя тэарэтычныя і практычныя наступствы. У тэарэтычным плане яна патрабуе разглядаць свет, у якім мы жывём, як самадастатковае ўтварэнне і засяроджвацца на

выяўленні яго ўнутраных законаў, якія вызначаюць яго функцыянаванне і развіццё. З практычнага пункту гледжання яна таксама звязана з разуменнем гэтага свету як месца сапраўднага самаздзяйснення чалавека і акцэнтуацыяй ролі і значэння чалавечай дзейнасці ў ім (сфармуляваны словамі Ф. Ніцшэ яе покліч гучыць наступным чынам: «Не хаваць болей галаву ў пясок нябесных рэчаў, а свабодна несці яе, зямную галаву, якая стварае сэнс Зямлі (перакладзена намі. – *А. Б.*)» [5, S. 137].

Караткевічава прыхільнасць да прынцыпу дыялектычнага іманентызму ясна і выразна выяўляецца ўжо ў прыведзенай вышэй тэзе, у якой пісьменнік фармулюе вызначальнае для высокай мудрасці перакананне і згодна з якой Прырода стварыла Чалавека як суб'екта спазнання самой сябе. Блізкасць пісьменніка да адпаведнага кола ідэй пераканальна пацвярджаецца і яго вострай крытыкай супрацьлеглай інтэлектуальнай стратэгіі (у абсягу якой субстанцыянальная падстава рэчаіснасці разглядаецца як трансцэндэнтная), а таксама асоб і сацыяльных інстытутаў, якія яе здзяйсняюць (яскравы мастацкі прыклад такой крытыкі – памянёны вышэй раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні»).

З вялікай энергіяй і мастацкай сілай У. Караткевіч адстойвае найважнейшы аксіялагічны прынцып, які вынікае з канцэпцыі дыялектычнага іманентызму, – прынцып вяршэнства «зямной» рэчаіснасці і чалавечага самаздзяйснення ў ёй. Гэтаму, безумоўна, істотным чынам паспрыялі яго незвычайная эстэтычная адоранасць, здольнасць тварыць і адчуваць прыгажосць (ужо неаплатонікі ясна бачылі небяспеку зямной прыгажосці для светапогляду, у якім першаснова свету выступае як трансцэндэнтная [4, p. 22]). Згаданая каштоўнасная арыентацыя знайшла яскравае ўвасабленне ў вершы «Панад шчыраю Шчарай, над шчодраю Шчарай». У гэтым творы У. Караткевіч з усёй магчымай выразнасцю даводзіць пра свой выбар на карысць няпростага чалавечага шляху ў зямным свеце, які ўражвае і натхняе ўласцівай яму прыгажосцю і веліччу, з якой не можа паспрачацца ніякі анёльскі вырай. І ў выніку адпаведная такому настрою думак максіма: «Збыць анёльства і стаць чалавекам, // Доўга, цяжка пакутваць пакутай жывых» [1, c. 114]. Зямны шлях, аднак, не толькі нясе нам пакуты, але і адорвае высокай асалодай (змагання, любові, сустрэчы з прыгажосцю: «Сыты быў бы, здаецца, паветрам духмяным, // А п'яны – ад празрыстай расінкі адной, // І любіў бы, і вымаліў людзям і каням // Дараванне, світанне, любоў і спакой» [1, c. 114–115]).

Такім чынам, высокі гуманістычны ідэал У. Караткевіча карэніцца ў супярэчлівых рэаліях зямнога свету. Аднак разам з тым ён выходзіць за межы наяўнага. Так і павінна быць, таму што ў самой сутнасці ідэалу закладзена (дыялектычная) супярэчнасць: ён вызначаецца рэальнасцю і адначасова вызначае яе. Ідэальнае здзяйсняецца і ўвесь час трансцэндуе сваю рэалізацыю, клічучы наперад. Канцэпцыя дыялектычнага

іманентызму не выключае трансцэндэнтнае, а ператварае яго ў пэўны момант здзяйснення іманентнай творчай першаасновы свету ў рэчаіснасці.

З даведзенага вышэй вынікае, што дасканалы чалавек і дасканалае грамадства заўжды знаходзяцца ў руху, развіцці і змаганні, што дасканаласць мае нестатычную прыроду. У. Караткевіч цудоўна разумеў і паказаў гэта ў сваіх творах. Той грамадскі стан, за які ён змагаўся ўсё жыццё, характарызуецца глыбокім адзінствам індывідуальнага і ўніверсальнага, у якім і праз якое кожны з гэтых момантаў раскрывае свой магутны творчы патэнцыял. Адсюль вынікае маральная праграма, згодна з якой «кожны павінен працаваць на карысць грамадства, бо яму – без мяне, без цябе (так, менавіта без **цябе** (вылучана У. Караткевічам. – *А. Б.*), друг!) – абысціся нельга» [3, с. 192]. Разам з тым, аднак, пісьменнік абвяшчае найвышэйшай хлуснёй сцверджанне, «што незаменных няма», што «найвышэйшая маральнасць – ахвяраваць чалавекам у імя грамадства» [3, с. 192]. Непраўдзівы і амаральны характар такога сцверджання абумоўліваецца невымернай значнасцю кожнага чалавека («нязмерны кошт **кожнай** (вылучана У. Караткевічам. – *А. Б.*) чалавечай асобы») [3, с. 192]. І толькі сама асоба мае права прыняць рашэнне аб самаахвярнай дзеі ў імя чалавецтва. Паводле У. Караткевіча, такое рашэнне з'яўляецца праявай найвышэйшай маральнасці [3, с. 192]. Тут выяўляецца яшчэ адзін важны аспект яго ідэалу – аспект героікі, гераічнага дзеяння. Увага пісьменніка засяроджана на гераічнай асобе, на асобе, якая прагне свайго Рагнарадзі, пасля чаго наступіць час «нясцерпнага» шчасця, не будзе патрэбы ў саміх героях і іх зброі, а раны людзям будзе наносіць толькі каханне [1, с. 227].

Сувязь гуманістычнага ідэалу з канцэпцыяй дыялектычнага іманентызму мае натуральны і празрысты характар. Калі творчы пачатак іманентны рэчаіснасці, тады ён неад'емным чынам прысутны ў кожнай чалавечай асобе. Кожны чалавек з'яўляецца яго непаўторным носьбітам, і грамадства будзе сапраўды гуманным толькі ў тым выпадку, калі кожная асоба будзе мець спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу. І калі ў ім «гнецца хоць адна ад крыўды спіна» [1, с. 177], яго ні ў якім разе нельга прызнаць адпаведным высокім ідэалам гуманнасці і справядлівасці. Разам з тым унікальнасць здзяйснення творчага пачатку ў кожным індывідзе робіць іншага і іншых грунтоўна значнымі і каштоўнымі для яго, што выступае таксама як падстава для ўсведамлення кожным чалавекам істотнай важнасці ўсёй сістэмы грамадскіх дачыненняў.

Іманентная прысутнасць Боскага ў Чалавеку не гарантуе, аднак, яго здзяйснення ў знешнім быцці. Дадзенае здзяйсненне з'яўляецца найвышэйшай задачай для кожнай асобы. Праўда, далёка не кожны індывід прагне яе вырашэння. У. Караткевіч цудоўна разумеў, што здзяйсненне ідэалу мае надзвычай складаны характар і ўсімі сіламі

імкнуўся паспрыяць абуджэнню кожнай чалавечай душы да пошуку, змагання і творчасці. Абуджэнне асобы мае, аднак, грунтоўнае грамадскае вымярэнне, і даробак пісьменніка (жыццёвы і творчы) выступае разам з тым як магутны покліч да пабудовы гуманнага і справядлівага грамадства.


1. *Караткевіч, У. С.* Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастац. літ., 2012–. – Т. 2 : Паэзія, 1961–1984 / падрыхт. тэкстаў і камент. А. Віраб'я ; рэд. т. В. Рагойша. – 2012. – 397 с.

2. *Караткевіч, У. С.* Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Мастац. літ., 2012–. – Т. 9 : Хрыстос прызямліўся ў Гародні. Евангелле ад Іуды / падрыхт. тэкстаў і камент. П. Жаўняровіча ; рэд. т. Т. Шамякіна. – 2015. – 734 с.

3. *Караткевіч, У. С.* Збор твораў : у 25 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Мастац. літ., 2012–. – Т. 13 : Публіцыстыка. З жыццяпісу. Адказы на пытанні. Эсэ-партрэты. Эсэ-артыкулы. Эсэ-фельетоны : 1957–1982 / падрыхт. тэкстаў і камент. П. Жаўняровіча ; рэд. т. В. Іўчанкаў. – Мінск : Мастац. літ., 2016. – 494 с.

4. *Beardsley, M. C.* Aesthetics, History of / M. C. Beardsley // The Encyclopedia of Philosophy : in 8 vol. – London ; New York, 1967. – Vol. 1. – P. 18–35.

5. *Nietzsche, F.* Sämtliche Werke : kritische Studienausgabe in 15 Einzelbänden / F. Nietzsche ; ed.: G. Colli [et al.]. – Band 4 : Also sprach Zaratustra I-IV. – München : Deutscher Taschenbuch Verlag GmbH & Co. KG ; Berlin ; New York : Walter de Gruyter, 1988. – 420 S.